МУЗЫКА

# Слова ў творчасці кампазітараў

Своеасаблівым музычным летапісам жыцця Беларусі за 70 гадоў можна назваць нота- і фанаграфічны паказальнік «Беларуская літаратура ў музыцы (1918—1989)», выдадзены Нацыянальнай бібліятэкай РБ і Мінскім інстытутам культуры (Мн., 1992 г.). Яго складальнікі — Генадзь Быстроў і Віялета Карсека. Сувязі беларускай літаратуры і музыкі, а дакладней выкарыстанне твораў беларускіх паэтаў і празаікаў (як вядомых, так і самадзейных аўтараў) кампазітарамі, адлюстравалася ў гэтай арыгінальнай працы. Трэба адзначыць, што прапануемы ўвазе чытача паказальнік — першая спроба сабраць і сістэматызаваць такія сувязі. Побач з вядомымі літаратурнымі імёнамі ў паказальніку сустракаюцца і менш знаёмыя, што стварае агульную карціну развіцця стасункаў беларускай літаратуры і музыкі.

Паказальнік «Беларуская літаратура ў музыцы» з'явіцца своеасаблівай дапамогай у вывучэнні беларускай культурнай спадчыны, беларускай мовы. Шмат неабходных звестак знойдуць у ім літаратура- і музыказнаўцы, даследчыкі эстрады й самадзейнай творчасці, педагогі ды сацыёлагі, журналісты і проста аматары беларускай паэзіі, музыкі. Карыстацца паказальнікам даволі лёгка, ён забяспечаны разгорнутым дапаможным апаратам, што дае магчымасць знайсці адказ амаль на любое пытанне. Акрамя іменнога паказальніка, ёсць паказальнік загалоўкаў і першых слоў тэксту музычных твораў, паказальнік музычных твораў для дзяцей. Асаблівую ўвагу звяртае на сябе прадметна-тэматычны паказальнік з уключанымі ў яго персаналіямі, якім прысвечаны былі асобныя творы.

С. КАВЯЗІНА,
галоўны бібліёграф.